ПРЫНЦЫПЫ ПЕРАЕМНАСЦІ Ў ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ 4

ВЫКРУТАСЫ НАРОДНАГА ДЫЗАЙНУ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

28 КАСТРЫЧНІКА 2022 г. ПЯТНІЦА № 212 (29834)

КАРАТКА

• Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху праходзіць сёння ў Беларусі. Мерапрыемствы, якія правядуць супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі, накіраваны на папярэджанне ДТЗ з удзелам пешаходаў.

• «Беллегпрам» нарасціў пастаўкі прадукцыі ў Расію і на азіяцкі рынак.

• База даных сацпадтрымкі і рэабілітацыі інвалідаў пачне працаваць у Беларусі з 1 верасня 2023 года.

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар КАРПЕНКА, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі:

«Разумеючы важнасць стабільнасці, міру і парадку ў краіне, у Беларусі да выбараў заўсёды ставяцца адказна, сур'ёзна. Калі чалавек сам не выбіраецца, то, прынамсі, актыўна ўдзельнічае ў працэсах абрання дэпутацкага корпуса і гэтак далей. Нам трэба будзе ў 2024 годзе правесці ўпершыню адзіны дзень галасавання. Такую маштабную кампанію мы яшчэ ні разу не праводзілі. Мы вывучалі вопыт суседзяў, Расійскай Федэрацыі (там даўно гэтая практыка ўжываецца). Вядома, мы імкнуліся, змяняючы заканадаўчыя акты, улічваць розныя нюансы, уключаючы і практыку ўжывання выбарчага заканадаўства, каб удасканаліць Выбарчы кодэкс, зрабіць яго аптымальным, каб у новых рэаліях ён мог спрацаваць на адзіны дзень галасавання і забяспечыць пераемнасць улады, стабільнасць у грамадстве і дзяржаве».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«КРЫЗІС — ГЭТА ЦЯЖКА, СКЛАДАНА, АЛЕ ГЭТА ШАНЦ ДЛЯ ЛЁГКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ»

Фота БелТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню канцэрна «Беллегпрам» Тацяну Лугіну і віцэ-прэм'ера Пятра Пархомчыка. Аднак размова не абмежавалася толькі тэмай дзейнасці канцэрна. Абмеркавалі сітуацыю ва ўсёй галіне.

«Лёгкая прамысловасць... Давайце абмяркуем, ці настолькі яна лёгкая, як часам нам здаецца», — задаў тон размовы кіраўнік дзяржавы. Ён пацікавіўся, як працуюць прадпрыемствы ў гэты няпросты санкцыйны перыяд.

«Мы дамаўляліся забыцца пра тое, што існуюць нейкія складанасці, цяжкасці. Яны звычайныя, пераадольныя», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу, што ў краіне няма прадпрыемстваў пазаведамаснай падпарадкаванасці ці, як яны называюцца, бязведамасных. Кіраўнік дзяржавы рэгулярна і пастаянна аб гэтым папярэджваў. Па словах Прэзідэнта, усе прадпрыемствы ў ведамстве, бо яны знаходзяцца ў краіне. «Гэта ваша справа, як вы будзеце імі кіраваць. Якія ў вас кантакты, сувязі, з прыватнымі недзяржаўнымі прадпрыемствамі, з прадпрыемствамі, якія не ўваходзяць у ваш канцэрн, як яны працуюць», — заўважыў ён.

СТАР. 2

Краўцы без справы не сядзяць

Фота БелТА.

Швейная фабрыка «Надэкс», што ў Мазыры, — адно з вядучых швейных прадпрыемстваў канцэрна «Беллегпрам». Цяпер на прадпрыемстве падрыхтавалі новую калекцыю адзення «Восень — зіма 22/23», якая ўключае некалькі разнавіднасцяў кашуль з цёплых тканін для падлеткаў і мужчын, а таксама базавых блузак для жанчын. Колькасць вырабаў для новай калекцыі складзе больш за 50 тысяч адзінак.

На слыху

ЯК ВЫЛЕЧЫЦЬ ГРЫП І COVID-19?

Каму паказаны прэпараты, якія ўздзейнічаюць на сам вірус, і як іх правільна прымяняць

Спецыялісты адзначаюць, што ў апошнія тыдні ў Беларусі назіраецца ўстойлівае зніжэнне захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі. Вірусы грыпу ў краіне пакуль не выяўляюцца, а выпадкі каранавірусnай інфекцыі нячастыя. Пры гэтым навука не стаіць на месцы. Скарбонка ведаў аб тым жа COVID-19 папаўняецца, і з'яўляюцца ўсё новыя метады лячэння і прафілактыкі, якія, хочацца спадзявацца, дазволяць перамагчы дадзеную інфекцыю. Пра іх расказалі выкладчыкі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі.

СТАР. 3

«КРЫЗІС — ГЭТА ЦЯЖКА, СКЛАДАНА, АЛЕ ГЭТА ШАНЦ ДЛЯ ЛЁГКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Другое пытанне, вынесенае на парадак дня, — экспарт. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, як ідзе пашырэнне геаграфіі паставак прадукцыі: «Мы ўсе кажам, што парушаны лагістычныя ланцужкі, лагістыка. Гэта сапраўды так, Але, тым не менш, многія прадпрыемствы і аб'яднанні з поспехам пераадолелі гэтыя праблемы і выбудавалі новыя шляхі паставак прадукцыі спажыўцоў».

І паралельна — пытанне насычэння ўнутранага рынку і імпартазамяшчэння. «Гэта бяда, калі нашы людзі бягуць у краму і вочы ў іх гараць пры выглядзе нейкай імпартнай прадукцыі, як быццам мы не можам пашыць сваю прадукцыю», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён выказаў упэўненасць, што ўсе ўдзельнікі рабочай сустрэчы апрануты ў айчыннае адзенне. Прэзідэнт прызнаўся, што сам апранаецца выключна ў адзенне нашай вытворчасці.

Вялікае пытанне, адно з галоўных — выкананне даручэнняў Прэзідэнта. «У нас ёсць звычка валакіціць гэтыя даручэнні, пакуль Прэзідэнт другі ці трэці раз не звернецца ў плане кантролю да гэтых даручэнняў», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, чаму на даклад запрошана кіраўнік Нацыянальнага статыстычнага камітэта Іна Мядзведзева: «Лічбы — гэта аб'ектыўная ацэнка работы легпрама на знешнім і ўнутраным рынку. Белстат бачыць усё». Лёгкая прамысловасць — сфера адказнасці і віцэ-прэм'ера Пятра Пархомчыка. Аднак, як заўважыў Прэзідэнт, віцэ-прэм'ер менш цікавіцца легпрамам, чым цяжкай прамысловасцю. Таксама ўдзел у рабочай сустрэчы прыняў старшыня Камітэта дзяржкантролю Васіль Герасімаў.

Фота БелТА.

У НАС ЁСЦЬ УСЁ. УСЁ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД НАС

Старшыня «Беллегпрама» Таццяна Лугіна адзначыла, што дзякуючы пільнай увазе Прэзідэнта і ўрада лёгкая прамысловасць захавалася і развілася за гэтыя дзесяцігоддзі. Яна прывяла актуальныя лічбы аб дзейнасці галіны. За 9 месяцаў бягучага года ўсёй лёгкай прамысловасцю краіны выраблена прадукцыі на суму 3 мільярды рублёў, канцэрнам — на паўтара мільярда рублёў. Індэкс прамысловай вытворчасці за 8 месяцаў склаў 95,2 працэнта. Да канца года плануецца выйсці на 100 працэнтаў. «У сакавіку-красавіку галіна востра зрэагавала на працэсы, якія адбыліся ў гэтыя месяцы. Рэцэсія ў маі намі была прыпынена. За май—верасень мы аднавілі станоўчую дынаміку работы. У трэцім кварталe мы нарасцілі аб'ёмы практычна на 9 працэнтаў. Экспарт з мая да верасня ўключна вырас на 4 працэнты. Нарошчванне экспарту мы лічым асноўнай, галоўнай задачай», — далажыла Таццяна Лугіна.

На што Прэзідэнт заўважыў, што экспарт — гэта правільна і добра, нікуды ад гэтага не дзецца. «Але мы ў свой час па вашай віне (у цэлым наша віна, што мы аддалі ўнутраны рынак незразумела каму) сюды вазілі ад рыззя, сэканд-хэнду, які карыстаецца папулярнасцю ў насельніцтва, да брэндаў. І ў нас ці анучы куплялі, ці брэнды. Там, дзе павінны працаваць прадпрыемствы краіны, а іх больш за 2000, у нас была дзірка», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што цяпер, калі з Расіі сышлі многія замежныя вытворцы, у беларусаў з'явіўся шанц заняць гэтую нішу на нашым асноўным расійскім і на ўнутраным рынках.

«Калі вы за гэты час, як іншыя галіны, дапусцім, сельская гаспадарка, не падыміцеся — грош вам цана. Цяпер вам ніхто не перашкаджае, і вы манапалісты, у вас няма сапраўднай канкурэнцыі, вось у чым магчымасці гэтага складанага перыяду. Я заўсёды пра гэта гавару. Крызіс — гэта цяжка, складана, але гэта шанц, магчымасць, і перш за ўсё для лёгкай прамысловасці. У нас жа ёсць усё: тканіны, швейныя машыны, кваліфікаваны персанал і тэхналагі, і кіраўнікі, і швачкі, і іншыя — у нас усё ёсць. Усё залежыць ад нас, як мы разгорнемся. І калі ў вас ёсць нейкія праблемы — вы скажыце, мы іх зараз вырашым, зараз іх вырашаць працей», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Вераніка КАНЮТА, Валерыя СЦЯЦКО.

❍ Каментарый у тэму

ЧАС УНІКАЛЬНЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ

Як расказала журналістам **старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна ЛУГІНА,** акцэнт падчас сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам быў зроблены на развіцці ўнутранага рынку. «Асноўнае патрабаванне кіраўніка дзяржавы — каб асартымент айчыннай вытворчасці быў на паліцах крам, — удакладніла старшыня канцэрна. — І мала таго, каб быў разнастайны — ён павінен быць яшчэ і прывабны, і, самае галоўнае, па даступнай усім цане».

Па словах Таццяны Лугіной, уся лёгкая прамысловасць краіны — каля дзвюх тысяч прадпрыемстваў розных форм уласнасці і маштабаў бізнесу. «Практычна 83 тысячы чалавек гатовы ствараць адзенне для розных сегментных груп і шматлікага асартыменту: пачынаючы ад дзіцячага, маладзёжнага адзення (гэта заўсёды самая цікавая і складаная група) да адзення паўсядзённага, дзелавога стылю, школьнай формы, — адзначыла яна. — Спектр магчымасцяў у лёгкай прамысловасці вялікі».

Закраналася падчас размовы з Прэзідэнтам, як паведаміла кіраўнік «Беллегпрама», і тэма забеспячэння ўнутранага рынку абуткам, скуранымі і галантарэйнымі таварамі. «Абмеркавалі і тыя вынікі, якія маем, і тыя задачы, якія яшчэ трэба будзе вырашаць, — заўважыла Таццяна Лугіна. — Мы гатовы забяспечыць унутраны рынак асартыментным пералікам тавараў, якія патрэбны сёння спажыўцу. Мы разумеем, што сёння маем унікальны час і ўнікальны шанц. Напэўна, за апошнія дзесяцігоддзі такога шанцу — павялічыць сваю долю і ўліванні на рынку ў лёгкай прамысловасці — не было. Увогуле, ці быў ён?!»

Што датычыцца магчымасцяў сферы лёгкай прамысловасці, старшыня канцэрна звярнула ўвагу, што ён наколькі крызісны, настолькі і ўнікальны. «Тых мер, якія сёння прапаноўвае ў тым ліку ўрад, дастаткова для таго, каб можна было выбудаваць бізнес, — падкрэсліла яна. — Сёння меры і па экспартным крэдытаванні дазваляюць кожнаму вытворцу скарыстацца ў тым або іншым выпадку льготным крэдытаваннем для падтрымкі бізнесу і, калі трэба, яго маштабавання. Дзяржава наколькі можа, настолькі імкнецца дапамагчы вытворцам. Сёння рынак адкрыты для ўсіх — як для ўнутранага вытворцы, так і для імпарцёра. Сёння многія вытворцы, асабліва буйныя, зрабілі стаўку на фірмовым гандлі — гэта было правільнае стратэгічнае рашэнне таго перыяду».

Як пераканана Таццяна Лугіна, мабілізацыя сёння павінна быць усюды: і ў эканоміцы, і ў вытворчасці, і ў кіраванні, і ў кіраўніцкіх рашэннях. «Мабілізацыя намаганняў усіх грамадзян, усіх прафесій — адзін з галоўных пасылаў сучаснасці, — адзначыла яна. — Мы яшчэ раз пераканаліся, што, калі будзем усе разам працаваць інтэнсіўна, часам звыш сіл, не шкадуючы сябе, выстаім, захаваем і памножым усё, што ёсць сёння ў краіне, а ёсць у нас нямала».

Заканадаўчыя навацыі

«Крок у бок эвалюцыйных змен нашага жыцця...»

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання па адукацыі, культуры і навуцы Ігар МАРЗАЛЮК правёў у Магілёве шэраг сустрэч, звязаных з абмеркаваннем законапраектаў Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь і аб Усебеларускім народным сходзе (УНС).

Адна з сустрэч адбылася ў Магілёўскім гарвыканкаме пры ўдзеле старшыні гарсавета Максіма Гурына. У зале сабраліся намеснікі кіраўнікоў буйных прадпрыемстваў па ідэалогіі. Пасля дыялогу дэпутат адказаў на пытанні карэспандэнта «Звязды».

— Наколькі неабходная вось такая інфармацыйна-тлумачальная работа з насельніцтвам па абмеркаванні законапраектаў?

— Самае важнае, што трэба адзначыць, гэта тое, што ўлада ўсе тыя абяцанні аб рэфармаванні па-

літычнай сістэмы выконвае, — падкрэсліў Ігар Марзалюк. — Гэта яшчэ адзін важны заканамерны крок у рэфармаванні і ў палітычнай эвалюцыі нашай сацыяльна-эканамічнай і палітычнай мадэлі на базе нашай Канстытуцыі. Мы робім яшчэ адзін крок у бок эвалюцыйных змен нашага жыцця, мы выбудоўваем тыя інстытуты, якія лічым неабходнымі, якія павінны гарантаваць дзяржаўную і тэрытарыяльную цэласнасць, недатыкальнасць нашай дзяржавы, і на сустрэчах з людзьмі тлумачым, у чым важнасць гэтых змен, якія функцыі будзе мець УНС, якая будзе існаваць працэдура абрання дэлегатаў, іх кампетэнцыі, а таксама тыя рэчы, якія мусіць зазнаць наш Выбарчы кодэкс у сувязі з тым, што змянілася Канстытуцыя. Мы не хаваем праекты закона, не ставім людзей перад выбарам — мы ідзём самым правільным шляхам прамой дэмакратыі. У выніку непасрэднай камунікацыі выпрацоўваем агульныя падыходы, карэкціруем праекты. Вось гэта сапраўдная беларускае суразмоўе — гэта тыя рэчы, якія ў выгадны бок адрозніваюць сітуацыю абмеркавання законапраектаў. Нават калі параўноўваць у нядаўняй перспектыве.

— Якія, на ваш погляд, найбольш важныя моманты закранутыя ў законапраектах?

— Тут сама па сабе істотная працэдура абрання суддзяў. На самай справе, калі глядзець аб'ектыўна, непрадузята, бачым рэзкае ўмацаванне судовай галіны ўлады, большую яе аўтаномнасць, большую суверэннасць. Тое, што тайным галасаваннем будзе выбірацца Усебеларускі народны сход, гэта шмат чаго каштуе. Гэта значыць, што, па сутнасці, суддзі Канстытуцыйнага і Вярхоўнага судоў набываюць яшчэ большую незалежнасць у прыняцці рашэнняў, большую аўтаномнасць. Для мяне гэта найважнейшая рэч. Тое ж самае датычыцца Цэнтральнай выбарчай камісіі. Па новай Канстытуцыі адзін чалавек, нават кіраўнік дзяржавы, не зможа ўздзейнічаць на Цэнтральную выбарчую камісію. Цэнтральная выбарчая камісія таксама будзе выбірацца Усебеларускім народным сходам, і таксама тайным галасаваннем. Акрамя таго, самыя важныя, на мой погляд, рэчы — дакладнае прапісванне тых інстытутаў, якія павінны гарантаваць легітымнасць і канстытуцыйнасць выбараў, усе выбарчыя працэсы.

— Якія пытанні часцей за ўсё задае грамадскасць?

— Многія заклапочаныя самой працэдурай квоты абрання дэлегатаў ва УНС — колькі, каго, якім чынам. Задаюць пытанні, звязаныя з АДКБ, з аб'яднаннем сіламі, з тымі новымі гарантыямі, якія будуць ствараць нейкія дадатковыя скрэпы, якія забяспечаць спакой на нашых вуліцах і ў дамах.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

ЯК ВЫЛЕЧЫЦЬ ГРЫП І COVID-19?

Вірусаў грыпу пакуль няма, каранавіруса — адзінкавыя выпадкі

Сітуацыя з рэспіраторнымі захворваннямі цяпер дастаткова аптымістычная, адзначае **дацэнт кафедры эпідэміялогіі і мікрабіялогіі БелМАПА, кандыдат медыцынскіх навук Аксана ТОНКА.** Дазорнае эпідэмічнае сачэнне апошніх тыдняў паказвае, што назіраецца ўстойлівае зніжэнне захваральнасці. У структуры захворэлых гэтай восенню пераважаюць дзеці, яны складаюць 60 %.

Па выніках лабараторных даследаванняў выяўлена цыркуляцыя негрыпозных рэспіраторных вірусаў. У прыватнасці, вірусаў парагрыпу, адэнавірусаў, рэспіраторна-сінцытыяльнага віруса, рынавірусаў, мета- і пнеўмавірусаў. Вірусы грыпу ў Беларусі пакуль не выяўлены.

— Аднак трэба памятаць, што працягваецца цыркуляцыя каранавіруснай інфекцыі. Мы працягваем выяўляць РНК каранавіруса. Вядома, на сёння працэнт станоўчых вынікаў у лабараторных умовах невысокі, гэта літаральна адзінкавыя выпадкі. Таксама мы бачым, што ў дзень у лабараторыі дастаўляецца невялікая колькасць проб, — кажа Аксана Тонка.

Прышчэпка ад грыпу — раз на год, ад COVID-19 — кожныя паўгода

Спецыяліст нагадала, што працягваецца бустарная вакцынацыя супраць COVID-19, а таксама пачалася кампанія вакцынацыі супраць грыпу. Ад апошняга ў сёлетнім сезоне прапанаваны дзве вакцыны: трохвалентная «Грыпол Плюс» расійскай вытворчасці і чатырохвалентная «Ваксігрып Тэтра» французскай вытворчасці. Першай прышчапляюць бясплатна, другой — за кошт небюджэтных сродкаў. Вакцыны ўтрымліваюць актуальныя ў гэтым сезоне рэкамендаваныя СААЗ штамы, прышчапляць можна нават дзяцей, пачынаючы з шасімесячнага ўзросту.

— У першую чаргу мы настойваем і прапануем вакцынавацца людзям з груп рызыкі. Гэта маленькія дзеці, дзеці, якія наведваюць арганізаваныя калектывы, знаходзяцца ў закрытых калектывах, дзеці і дарослыя, якія маюць хранічныя і спадарожныя хваробы, людзі, якія маюць высокую рызыку заражэння — медработнікі, людзі, якія забяспечваюць бяспеку ў дзяржаве, а таксама людзі старэйшыя, за 65 гадоў. Канец кастрычніка — пачатак лістапада — самы час, каб сфарміраваць імунітэт і засцерагчы сябе ў бягучым сезоне ад грыпу, — дадала Аксана Тонка.

Поўны курс вакцынацыі супраць каранавіруснай інфекцыі ў нашай краіне завяршыла 6,5 мільёна чалавек, гэта каля 71 % насельніцтва. Дарэчы, СААЗ рэкамендуе дасягнуць 70-працэнтнага ахопу вакцынацыяй. Многія зрабілі і бустарныя прышчэпкі.

— Арыентавацца варта на тое, што супраць COVID-19 трэба прайсці курс вакцынацыі з дзвюх прышчэпак, затым кожныя паўгода рабіць бустарную прышчэпку. Ад грыпу варта прышчапляцца штогод, бо кожны год вакцыны мяняюцца і іх дзеянне хапае дзесьці на 12 месяцаў, — тлумачыць Аксана Тонка. — Калі ў вас на сёння падышоў час шасці месяцаў ці прайшло больш за чатыры з папярэдняй вакцынацыі, ёсць магчымасць, прыйшоўшы ў паліклініку, адначасова зрабіць вакцынацыю як ад грыпу, так і ад каранавіруснай інфекцыі. Прышчэпкі робяць у адзін час, у розныя рукі, розными шпрыцамі, таму непакоіцца аб наступствах не варта. Калі перажываеце, можна зрабіць іх з інтэрвалам у тыдзень-два.

Ці эфектыўныя тэсты на COVID-19, зробленыя дома?

Сёння дыягностыка каранавіруснай інфекцыі магчымая ў хатніх умовах. У аптэчнай сеткі маюцца тэст-сістэмы розных вытворцаў. У першую чаргу, гэта тэсты на наяўнасць антыгена SARS-COV-2. Як сцвярджаюць спецыялісты, іх эфектыўнасць нядрэнная. Пры гэтым нагадваюць: калі пры падазрэнні на захворванне тэсціраванне ў хатніх умовах дало адмоўны вынік, варта ўсведамляць, што ні адзін тэст не валодае 100-працэнтнай адчувальнасцю. Таму пры захаванні клінічнай сімптаматыкі, з'яўленні новых, больш цяжкіх сімптомаў лепш звярнуцца па медыцынскую дапамогу.

Акрамя таго, вельмі важна правадзіць тэст у першыя гадзіны і дні захворвання, калі вірусная нагрузка найбольшая. Чым больш дзён прайшло ад пачатку захворвання, тым менш віруса ў рэспіраторных шляхах і тым меншая імавернасць, што экспрэс-тэсты спрацуюць.

Што новага ў лячэнні?

Калі яшчэ 20—25 гадоў таму лячэнне вірусаў зводзілася да сімптаматычнага, накіраванага на праявы захворвання ў канкрэтнага пацыента, то сёння ў арсенале ўрачоў усё неабходнае для ўздзеяння на сам вірус грыпу, каранавірус і іншыя. Такія прэпараты маюцца і ў аптэках. Яны не даюць вірусу размнажацца ў арганізме і наносіць урон органам і сістэмам. Адзіная важная ўмова — лячэнне мусіць пачынацца своечасова.

— Нашы пацыенты любяць пачакаць, а раптам пройдзе само, у такой сітуацыі мерапрыемствы па этыятропнай (супрацьвіруснай. — **«Зв.»**) тэрапіі будуць запозненымі і бессэнсоўнымі, — кажа **старшы выкладчык кафедры інфекцыйных хвароб і дзіцячых інфекцый БелМАПА Дзмітрый ПАДУТА.** — Шэраг лекавых сродкаў супраць каранавіруснай інфекцыі, якія маюцца ў аптэчнай сеткі, прымяняецца толькі ў першыя пяць дзён, па грыпу — у першыя пяць-дзесяць дзён.

З іншага боку, тлумачыць спецыяліст, гэта не адмяняе і сімптаматычнай тэрапіі — прымянення гарачкапаніжальных, гарачага пітця, пасцельнага рэжыму, але пры ўмове прымянення супрацьвірусных прэпаратаў пералічанае спатрэбіцца ў меншай ступені.

— Мерапрыемствы па этыятропнай тэрапіі пры грыпе і каранавірусе найперш паказаны ў групах рызыкі — людзям, старэйшым за 60-65 гадоў, пацыентам з сур'ёзнымі хранічнымі хваробамі сардэчна-сасудзістай, лёгачнай сістэмы, дзецям і цяжарным жанчынам. У іх ёсць рызыка больш цяжкага ходу хваробы і абвастрэння тых праблем, якія былі і раней, — тлумачыць Дзмітрый Падута.

Ці абнаўляюцца рэкамендацыі?

Рэгламенты аказання дапамогі па меры назапашвання новых ведаў дастаткова рэгулярна абнаўляюцца. У Беларусі яны мяняліся некалькі разоў, апошні раз — мінулым летам.

— Пакуль няма падстаў мяняць рэгламент, бо ён адпавядае ўсім сусветным падыходам, у тым ліку і вядучых эканамічна развітых краін. Мы стараемся сачыць, па якіх стандартах працуюць калегі з іншых краін, і нашы рэкамендацыі адпавядаюць і эпідэмічнай абстаноўцы, і тым варыянтам віруса, якія цыркулююць, — адзначае Дзмітрый Падута.

Праз які час вакцынавацца, калі перахварэў?

Можа быць шмат варыянтаў, і іх лепш абмеркаваць са сваім урачом. У цэлым проціпаказаннем да вакцынацыі супраць грыпу з'яўляецца востры перыяд і стан гарачкі. Калі пацыент паправіўся, супрацьпаказанняў няма. Перанесенае раней захворванне (у тым ліку грып, каранавірусная інфекцыя) не з'яўляецца супрацьпаказаннем да вакцынацыі. Пры гэтым неабавязкова рабіць тэст на антыцелы, іх наяўнасць ці адсутнасць не азначае наяўнасці ці адсутнасці імунітэту.

Ці дапамогуць не захварэць вітаміны?

Лепш зрабіць свой рацыён разнастайным, дадаўшы ў яго больш гародніны і садавіны. Не варта гнацца за экзатычнымі відамі, бо наш метабалізм больш настроены на мясцовыя прадукты, лічыць Дзмітрый Падута. Калі ж вы жадаеце прымаць вітаміны, то лепш выбіраць мультывітамінныя комплексы на свой густ і кашалёк.

— Калі вы захварэлі, то павінны ўсведамляць, што можаце быць небяспечнымі для навакольных. На працягу 7-10 дзён у залежнасці ад выразнасці клінічных сімптомаў варта старацца пазбягаць кантактаў, асабліва з асобамі з груп рызыкі, — нагадвае Аксана Тонка. — Для прафілактыкі рэкамендуюцца здаровае харчаванне, свежае паветра, заняткі фізкультурай. Падчас пандэміі COVID-19 было даказана, што гэта ўплывае не толькі на наш фізічны, але і на псіхічны стан. Прычым такія мерапрыемствы больш карысныя, чым кантактаванне з сябрамі і наведванне вечарынак.

Алена КРАВЕЦ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста накіраваў спачуванне Прэзідэнту Ісламскай Рэспублікі Іран Ібрагіму Раісі ў сувязі з гібеллю людзей у выніку тэракта. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. «Беларусь рашуча асуджае злачынствы, якія прыводзяць да гібелі ні ў чым не вінаватых людзей і паганяць мірнаму жыццю краіны», — адзначаецца ў спачуванні.

Кіраўнік мінпрацы ЗША папярэдзіў аб катастрофе для эканомікі з-за міграцыі

Міністр працы Злучаных Штатаў Марці Уолш лічыць, што няслушная палітыка партыі ў ЗША адносна пытання міграцыі можа стаць адной з самых сур'ёзных памылак у амерыканскай палітыцы ў галіне працы. «Мы кажам аб занепакоенасці з-за рэцэсіі, аб інфляцыі, я думаю, што ў нас будзе сур'ёзнейшая катастрофа, калі мы не атрымаем у нашым грамадстве больш работнікаў, а зрабіць тое мы можам з дапамогай міграцыі», — заявіў Уолш. Раней прэзідэнт ЗША Джо Байдэн дапусціў, што яго краіна можа сутыкнуцца з эканамічнай рэцэсіяй, аднак яна не будзе мець значны характар, між тым міністр гандлю ЗША Джына Раймонда не выключыла, што ў краіне магчымая значная рэцэсія.

У выніку нападзення тэрарыстаў на маўзалей у Іране загінулі 15 чалавек

Трое невядомых адкрылі агонь у маўзалеі Шах-Чэрах у Шыразе, размешчаным у іранскай правінцыі Фарс. Сілам правапарадку ўдалося затрымаць двух баевікоў. Ахвярамі тэракта сталі не менш чым 15 чалавек, 27 атрымалі раненні. «Згодна з папярэднімі данымі, тэракт здзейснены радыкальнымі вахабітамі, якія скарысталіся нядаўнім аслабленнем мер па забеспячэнні бяспекі», — прыводзіць інфармацыйнае агенцтва Tasnim меркаванне крыніцы ў сілавых структурах. Па звестках агенцтва Reuters, адказнасць за нападзенне ўзяла на сябе тэрарыстычная групоўка «Ісламская дзяржава».

Урад Швейцарыі заявіў аб прыхільнасці краіны палітыцы нейтралітэту

Гэта дапамагае Жэневе манеўраваць ва ўмовах нясімпатый міжнароднай сітуацыі. Такая пазіцыя кіраўніцтва краіны выкладзена ў заяве, размешчанай на сайце швейцарскага Кабміна, паведаміў ТАСС. У заяве адзначаецца, што ўсе папярэднія гады Швейцарыя, дзякуючы свайму нейтралітэту, магла гарантаваць сваю бяспеку і самастойна вызначаць знешнюю палітыку. У сувязі з гэтым дзяржава і надалей мае намер прытрымлівацца адпаведнай палітыкі. Урад таксама разлічвае, што прыхільнасць Швейцарыі нейтралітэту будзе прызнана ва ўсім свеце.

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Торговому открытому акционерному обществу «Гродно Культторг»

Аукцион состоится 16.11.2022 г. в 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

Лот № 1

Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона	ЛОТ 1: - капитальное строение, инв. № 400/С-135774, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Победы, 22Б, площадь – 96,5 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройства территории; - капитальное строение, инв. № 400/С-152529, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Победы, 22Б, площадь – 346,7 кв. м, назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад; - линия электропередачи АПВГ 3х2,5 протяженностью 44 м, линия электропередачи АВВГ 4х16 протяженностью 42 м. Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 440100000001011667, площадью 0,0825 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания склада), находящегося по адресу: г. Гродно, ул. Победы, 22Б. Условия оплаты – оплата с рассрочкой на 12 месяцев со дня заключения договора купли-продажи, с ежемесячной индексацией платежей и первоначальным платежом в течение одного месяца с момента заключения договора-купли продажи в размере 30 % от цены продажи. Условия проведения аукциона – в соответствии с генеральным планом г. Гродно объект расположен в производственной и коммунально-складской зоне
Начальная цена продажи	149 199,30 руб. (сто сорок девять тысяч сто девяносто девять рублей тридцать копеек) с учетом НДС
Сумма задатка	14 919 руб. (четырнадцать тысяч девятьсот девятнадцать рублей)
Реквизиты для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Место, дата и время окончания приема заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – **14.11.2022 г. до 15.00**

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 20.04.2022 г.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony

ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

по жилому дому «Корабль» по г.п. 3.1 в составе объекта «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными объектами общественного назначения и обслуживания в границах ул. Семашко – ул. Петровщина. Санкт-Петербургский квартал в г. Минске». 2-я очередь строительства. Жилые дома «Корабль» по г.п. №№ 3.1, 3.2, торгово-общественные помещения №№ 5.1, 5.2, 5.3 по г.п.»,

опубликованную в газете «Звязда» от 02.07.2022 № 128 (29750)

Застройщик: коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» зарегистрировано Мингорисполкомом 05.01.2015 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192400611.

Юридический и почтовый адрес: ул. С. Есенина, 4-107, г. Минск, 220025, Республика Беларусь, тел./факс +375 (17) 234-16-99, тел. +375(17) 234-16-98.

В период с 01.11.2022 по 30.11.2022 при единовременной уплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме стоимость 1 кв. м общей площади квартир для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей **3 090,00 белорусских рублей.**

Стоимость строительства машино-места – 24 613,16 белорусского рубля.

Срок действия настоящей проектной декларации – с 01.11.2022 по 30.11.2022.

Документы для заключения договоров создания объектов долевого строительства будут приниматься и регистрироваться в ходе личного приема и в порядке живой очереди с 8.30 01.11.2022 по адресу: г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213 (офис продаж).

УНП 192400611

У цэнтры ўвагі

Вывучэнне гісторыі — падмурак для выхавання патрыятызму

Праект новай Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі абмеркавалі ў НАН

На базе Акадэміі навук прайшло пасяджэнне Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Савет па гістарычнай палітыцы функцыянуе з пачатку года. У яго складзе сфарміравана некалькі камісій па напрамках дзейнасці. На апошнім Савеце разглядаліся пытанні школьнай гістарычнай адукацыі. У прыватнасці, на пасяджэнне быў вынесены праект новай Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі, распрацаваны спецыялістамі Нацыянальнага інстытута адукацыі, Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

Як адзначыў **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ**, актуальнасць распрацоўкі канцэпцыі абумоўленая наяўнасцю патэнцыяльных і рэальна існуючых пагроз нацыянальнай бяспецы Беларусі. Сярод іх — замахі на незалежнасць, тэрытарыяльную цэласнасць, суверэнітэт і канстытуцыйны лад беларускай дзяржавы, падмена або скажэнне традыцыйных духоўна-маральных каштоўнасцяў беларускага народа, а таксама распаўсюджванне дэструктыўнага інфармацыйнага ўздзеяння на асобу, грамадства і спробы дэфармацыі гістарычнай памяці, мэтанакіраванае скажэнне гісторыі.

Пры гэтым міністр адукацыі звярнуў увагу на той факт, што Канцэпцыя школьнай гістарычнай адукацыі датычыцца не толькі школьных прадметаў — гісторыі Беларусі або інтэграванага курса гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі, яна закранае таксама пытанні міжпрадметных сувязяў. У ёй закладзены ўзаемасувязі з беларускай літаратурай, грамадазнаўствам, геаграфіяй і шэрагам іншых дысцыплін. Яшчэ адзін найважнейшы аспект у плане навізны канцэпцыі — пазаўрочная дзейнасць. У кожнай школе сёлета павінна быць створана музейная экспазіцыя.

Дарэчы, Міністэрствам адукацыі ўжо распрацавана палажэнне аб рэспубліканскім конкурсе школьных экскурсаводаў, каб школьнікаў можна было прыцягваць да вывучэння гісторыі не толькі ў рамках урокаў, але і ў пазаўрочнай дзейнасці. Можна задзейнічаць мноства формаў работы — экскурсіі, краязнаўчую дзейнасць, лекторыі, выязныя мерапрыемствы на месцы баявой славы і іншыя, якія маюць важнае гістарычнае значэнне.

Канцэпцыя прадугледжвае канцэнтрычны прынцып пабудовы зместу школьнай гістарычнай адукацыі і вывучэнне курса «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» ў 10-11-х класах. Увядзенне новага курса плануецца з 2025/2026 навучальнага года, новы навучальны дапаможнік па курсе папярэдне пройдзе апрабацыю ў асобных установах адукацыі.

Па словах міністра, з 1 верасня пытанні гістарычнай адукацыі былі істотна ўдасканалены на ўсіх узроўнях. Гэта звязана і з правядзеннем Генпракуратурай крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа, і з уступленнем у сілу новай рэдакцыі Канстытуцыі. Таксама з 1 верасня ў ВНУ распачалося выкладанне новай дысцыпліны — «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці».

«Мы не стаім на месцы і бачым, што для фарміравання цэласнай карціны ў нашых навучэнцаў адносна падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі, вельмі важна аддаць сёння ўвагу пераемнасці. І Канцэпцыя школьнай гістарычнай адукацыі нацэлена менавіта на гэта», — падкрэсліў у гутарцы з журналістамі кіраўнік ведамства.

Надзея НІКАЛАЕВА.

САКРАЛЬНЫ СІМВАЛ ТВОРЧАСЦІ

Сёння, 28 кастрычніка, а 17-й гадзіне ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі пройдзе творчы вечар народнага пісьменніка Беларусі Мікалая ЧАРГІНЦА, прысвечаны яго 85-годдзю. Збяруцца прыхільнікі таленту, добрыя сябры вядомага літаратара. Павіншаваць Мікалая Іванавіча прыйдуць студэнты сталічных ВНУ.

Не ведаю, дзе, у якіх краінах свету яшчэ ёсць такое сакральнае месца. І прыемна, што парк жыве сваім жыццём, прыцягвае наведвальнікаў якраз паблізу Нацыянальнай бібліятэкі краіны, як мне падаецца, — самай прыгожай бібліятэкі свету.

Падзею пракаментаваў вядомы **празаік, публіцыст Сяргей ТРАХІМЁНАК:**

Фота Канстанціна ДРОБАВА.

— Прыемна бачыць сёння ўсіх калег. Восеньскі дзень, высадка дрэва, высадка дуба як сімвала аховы чалавечага жыцця, сімвала моцы, трываласці, доўгажыхарства, чалавечай годнасці нас аб'яднала. Спадзяюся, што мы адзіныя і ў служэнні нашай краіне, нашаму народу. Рады, што падтрымаць юбіляра, народнага пісьменніка Беларусі прыйшлі сябры з Мінскага абласнога і Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў, журналісты, дзеячы культуры, бібліятэкары горада.

А ўвесну, як адзначылі ў СП Беларусі, парк Пісьменнікаў папоўніцца новай алеяй.

Мікола БЕРЛЕЖ.

А ўчора побач з Нацыянальнай бібліятэкай у Парку пісьменнікаў Мікалай Чаргінец пасадзіў дуб. Дарэчы, парк быў заснаваны да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Пра гэта сведчыць і памятны камень-валун з мемарыяльнай дошкай. Тады, у 2017 годзе, па ініцыятыве Мікалая Іванавіча, які з'яўляўся старшынёю СП Беларусі, і быў заснаваны Парк пісьменнікаў.

— Я ўдзячны за падтрымку органам дзяржаўнага кіравання, удзячны Мінскаму гарвыканкаму, — гаворыць ганаровы старшыня СПБ Мікалай Чаргінец, — што нашу ідэю ў 2017 годзе ўхвалілі.

Надвор'е

ЛІСТАПАД — НА НОСЕ, А Ў НАС АМАЛЬ ПЛЮС 20

Вясёлая ў нас сёлета восень, калі ў пачатку кастрычніка ў нашай краіне адзначалася пераважна адмоўная анамалія тэмпературы паветра, то на апошнім тыдні кастрычнік памяняў свой настрой. Прыток цёплага і вільготнага паветра з Атлантыкі павысіў паказанні тэрмометраў. Цяпер у нас сярэднесутачная тэмпература паветра на 2—7 градуса перавышае кліматычную норму, што больш адпавядае пачатку кастрычніка. Цёплае надвор'е захавалася ў Беларусі да канца тыдня і нават у першыя дні лістапада, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У суботу ў многіх раёнах краіны будуць адзначацца кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай месцамі па краіне магчымы туман. Днём у асобных раёнах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—11 градусаў, днём — ад плюс 11 градусаў да 18 цяпла.

У апошнія суткі кастрычніка, а дакладней — у начныя і ранішнія гадзіны — умовы надвор'я будуць вызначаць няўстойлівыя паветраныя масы, якія паступілі да нас з поўначы Балтыйскага мора. Значыць, ноччу ў нас месцамі па краіне невялікія дажджы. Днём з Заходняй Еўропы на тэрыторыю Беларусі распаўсюдзіць свой уплыў зона павышанага атмасфернага ціску, у сувязі з чым істотных ападкаў не прагназуецца. Месцамі па паўночным усходзе будзе ўзмацняцца вецер парывамі да 15—18 м/с. Уначы тэмпература паветра — 5—10 градусаў. Днём паветра прагрэецца да 7—14 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку тыдня наша тэрыторыя будзе знаходзіцца пад уплывам зоны павышанага атмасфернага ціску. Толькі ў сераду днём спакой парушыць няўстойлівая паветраная маса, «з прапіскай» у акваторыі Балтыйскага мора. Разам з тым тэмпературны фон па-ранейшаму будзе перавышаць сярэднія шматгадовыя значэнні.

У панядзелак чакаецца пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі згусціцца туман. Тэмпература паветра ноччу будзе вагацца ад 0 да плюс 7. Днём прагназуецца 6—13 градусаў, па паўднёвым захадзе — да плюс 14—16 градусаў. У першы дзень лістапада будзе пераважна без ападкаў. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі туман. Ноччу тэмпература паветра складзе 2—9 градусаў, а па ўсходзе халадней — ад мінус 1 да плюс 1 градуса. Максімальная тэмпература днём — 7—14 градусаў, па паўднёвым захадзе —15—18 цяпла. Яшчэ на пару градусаў цяплей — і можна казаць пра позняе бабіна лета.

Сяргей КУРКАЧ.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191021390
Продавец	Минское областное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24. УНП 600037767
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. УНП 191224638, www.ipmtorgi.by

Предмет электронного аукциона

Лот № 1. Адрес: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, аг. Озерцо, ул. Центральная

Магазин № 1 (общ. пл. 127,2 кв. м, инв. № 600/С-132938, составные части: пристройка, склад, уборная).
Сведения о земельном участке: пл. 0,0885 га, предоставлен на праве аренды (срок действия по 04.04.2041) для обслуживания здания магазина № 1

Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 180 872,46 бел. руб. (снижена на 60 %)

Лот № 2. Адрес: Минская обл., Минский р-н, Самохваловичский с/с, аг. Самохваловичи, пер. Калинина, д. 36

Столовая (общ. пл. 282,8 кв. м, инв. № 600/С-117001, составные части: три пристройки).
Сведения о земельном участке: пл. 0,0659 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания столовой

Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 192 060,00 бел. руб. (снижена на 60 %)

Лот № 3.
Адрес: Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, аг. Сеница

Здание торгового центра (общ. пл. 3109,6 кв. м, инв. № 600/С-100734, составные части и принадлежности: подвал, площадка).
Сведения о земельном участке: пл. 0,5973 га, предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов розничн. торговли.
Обременение: площади здания частично сданы в аренду. Договоры аренды № 24/21 от 31.03.2021 с ОАО «Белагропромбанк», № 22/21 от 31.03.2021 с РУП «Белпочта» без возможности досрочного расторжения до 31.10.2026»

Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 2 990 000,00 бел. руб. (снижена на 13 %)

Лот № 4. Адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Новая Заря, 34А-2

Кафе «Хельсинки» (общ. пл. 768,1 кв. м, инв. № 602/D-35365)

Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 709 560,32 бел. руб. (снижена на 10 %)

Лот № 5. Адрес: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Молодёжная, 12

Административное здание (общ. пл. 1079,3 кв. м, инв. № 630/С-54835).
Сведения о земельном участке: пл. 0,1244 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания администрат. здания

Начальная цена лота № 5 с НДС 20 % – 550 800,00 бел. руб. (снижена на 50 %)

Лот № 6.
Адрес: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, д. Городище

Магазин № 13 (общ. пл. 234,7 кв. м, инв.№ 600/С-132848; составные части и принадлежности: пристройка, крыльцо.
Сведения о земельном участке: пл. 0,2073 га предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 24.02.2041) для обслуживания здания магазина № 13. Ограничения (обременения) прав: охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В (пл. 0,0055 га), охранная зона отдыха «Птичь», водоохран. зона вне прибреж. полосы ручья № 9

Начальная цена лота № 6 с НДС 20 % – 161 203,19 бел. руб. (снижена на 15 %)

Лот № 7. Адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, Шацкий с/с, д. Габриелевка, 15А-2

Магазин (общ. пл. 151,2 кв. м, инв. № 602/D-30858)

Начальная цена лота № 7 с НДС 20 % – 40 729,92 бел. руб.

Лот № 8. Адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, Руденский с/с, д. Анетово, ул. Цветочная, 20А

Магазин (общ. пл. 158,3 кв. м, инв. № 602/С-13806).
Сведения о земельном участке: пл. **0,0719** га, предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 29.06.2032) для обслуживания здания специализир. розничн. торговли

Начальная цена лота № 8 с НДС 20 % – 30 555,76 бел. руб.

Лот № 9.
Адрес: Минская обл., Минский р-н, Крупицкий с/с, д. Каралино

Магазин № 55 (общ. пл. 138,5 кв. м, инв. № 600/С-137501, составные части: подвал, две пристройки, вход в подвал, крыльцо).
Сведения о земельном участке: пл. 0,0932 га, предоставлен на праве аренды (срок действия по 12.12.2041) для обслуживания здания магазина № 55. Ограничения (обременения) прав: зона санит. охраны водных объектов, используемых для питьевого водоснабжения (3 пояс)

Начальная цена лота № 9 с НДС 20 % – 100 180,85 бел. руб.

Лот № 10. Адрес: Минская обл., Минский р-н, Юзуфовский с/с, аг. Юзуфово, ул. Юбилейная, 5

Здание магазина № 51 (общ. пл. 202,8 кв. м, инв. № 600/С-163556, составные части: пристройка, сарай).
Сведения о земельном участке: пл. 0,1445 га предоставлен на праве аренды (срок действия по 20.12.2117) для обслуживания здания магазина № 51. Ограничения (обременения) прав: водоохранные зоны рек и водоемов, охран. зоны электрич. сетей (до 1000 Вт, 0,0150 га)

Начальная цена лота № 10 с НДС 20 % – 171 600,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, штрафные санкции прописаны в соглашении о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение по лотам №№ 1, 2, 4–10 – 4 %, по лоту № 3 – 1,5 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении торгов по лотам №№ 1–9 опубликовано в газете «Звязда» 05.10.2022

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
30.11.2022 с 13.00 до 14.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 29.11.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

ЛІСТЫ ДА...

Падарункам для прыхільнікаў музычнага мастацтва стане чарговая прэм'ера на сацыякультурным тэлеканале «Беларусь 3». Тут 29 кастрычніка пакажуць спектакль-канцэрт «Ван Гог. Лісты да брата».

«Гэта гісторыя мастака, які, нягледзячы на ўсе абставіны, да апошняга хацеў жыць, працаваць і, не лічачы сябе вялікім творцам, пакінуць пасля сябе штосьці, што хоць неяк апраўдвала б яго неверагодна цяжкае жыццё», — дзяліўся напярэдадні прэм'еры ў Белдзяржфілармоніі, што адбылася нядаўна, артыст Яўгений Міронаў.

У спектаклі-канцэрце ў выкананні Яўгенія Міронава і ў суправаджэнні камернага ансамбля «Салісты Масквы» пад кіраўніцтвам маэстра Юрыя Башмета гучаць лісты Вінсента Ван Гога да брата Тэа, у якіх знайшлі адлюстраванне думкі мастака, адрасаваныя не толькі роднаму чалавеку, але і самому сабе, Богу, Сусвету. Таксама там гучаць сачыненні Шнітке, Грыга, Брамса, Бетховена і іншых, у тым ліку і ў аўтарскіх апрацоўках Юрыя Башмета і кампазітара Кузьмы Бадрова. А што атрымалася, зможам убачыць у суботу вечарам на «Беларусь 3».

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 177

З 11 да 19 кастрычніка ў Кабулеці (Грузія) праходзіў чэмпіянат свету па шашках-64 сярод мужчын і жанчын. Як заўсёды, свой высокі клас прадэманстравалі беларускія шашысты. Спачатку прайшлі спаборніцтвы па хуткай праграме. Чэмпіёнамі свету сталі Ігар Міхальчанка і Вікторыя Нікалаева. Сярэбраныя медалі выйгралі Аляксей Куніца і Вера Хвашчынская. У другі дзень чэмпіянату ў бліскавічнай праграме Ігар і Вікторыя паўтарылі свой поспех і зноў сталі першымі. Андрэй Валюк заняў другое месца, Вера Хвашчынская — трэцяе. Самай доўгай была класічная праграма, спартсмены спаборнічалі шэсць дзён. 17-гадовая Вікторыя Нікалаева ўпэўнена прайшла ўсю цяжкую дыстанцыю і выйграла сваё трэцяе «золата», стаўшы абсалютнай чэмпіёнкай свету сярод жанчын. Паліна Петрусёва здабыла бронзавы медаль. Андрэй Валюк, захапіўшы лідарства з першых тураў, заваяваў «золата» сярод мужчын. Ігар Міхальчанка — сярэбраны прызёр.

№ 147 Братан В. — Валюк У.

Белыя простыя: c1, g1, b2, c3, e3, f4, h6; (7)

Чорныя простыя: a5, c5, d6, f6, b8, d8, f8 (7)

Беларускі гросмайстар, які гуляў чорнымі, правёў выразшальную атаку.

1…c5-b4! 2.e3-d4 b4:d2 3.c1:e3 d8-c7 пагроза 4.b2-c3 і прарыў a5-b4! 5.c3:a5 d6-e5 6.f4:d6 c7:c3+

Наступная кампазіцыі складзеныя вядучым аддзела.

№ 148



№ 148

Белыя простыя: a1, a7, e5, f2, f4, f6, g1 (7)

Чорныя простыя: b2, b4, b6, b8, c3, c5, h2 (7)

№ 149

Белыя простыя: b4, d4, f4, a5, c5, d6 (6)

Чорныя простыя: b2, d2, a3, f6, a7, g7, b8 (7)

№ 150

Белыя простыя: g1, h2, f4, b6, h6, a7 (6)

Чорныя простыя: c3, d4, h4, a5, c5, f6, g7, f8 (8)

№ 151

Белыя простыя: g1, d4, c5, d6, h6 (5)

Чорныя простыя: b2, d2, f2, e3, a5, g7, f8 (7)

Дзве наступныя пазіцыі па правілах бразільскіх шашак

№ 152

Белыя простыя: g3, d6, f6, c7, e7 (5)

Чорныя простыя: b2, b4, h4, c5, b8 (5)

№ 153

Белыя простыя: c1, d2, f2, c3, e3, g3, a5 (7)

Чорныя простыя: h2, b4, e5, g5, f6, a7, c7, e7, g7 (9)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

З лістоў чытачоў. *«Дзякуем аўтарам і вядучаму за цікавую інфармацыю аб шашачным жыцці краіны»*, — пішуць Ф. Карпей і Л. Жыхар.

Праверце свае рашэнні: Выпуск № 176 ад 14.10.22.

№ 140 1. g3-h4 a3:c1 2. g5-h6 e5:e1 3. g1-f2 e1:g3 4. h2:f4 c1:g5 5. h4:a5 d4-e3 6. a5-d8 + копія Ручкін Б. «Шашкі» 1988 г. № 3 (Паведаміў уладальнік картатэкі шашачных кампазіцый А. Панчанка (Днепр))

№ 135 1. g1-h2 a5:c3 2. h2:f4 e5:g3 3. a1-b2 c3:a1 4. g5-f6 a1:g7 5. h6:h4 +

№ 141 de5, e5(g5), h6(d2), d6(e5), c7(d6), g7(f6), c3, g5(d4), f6(c3), e3(b2), f4=

№ 144 1.32-28? [1.43-38! 26:28 2.27-21 16:27 3.38-32 27:38 4.42:15 +] 1...26:37 2. 42:31 12-17? 3. 28-22 17:28 4. 27-21 16:27 5. 31:15 +

№ 145 1. c5-b6 a7:c5 2. g3-f4 g5:e3 3. f2:h8 +

№ 146 1. d4-e5 f6:b6 2. g1:a7 a3:c5 3. a7:b8 g3-f2 4. d2-e3 f2:d4 5. b8-f4 d4-c3 6. f4-c1 +

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), У. Ваўчкоў (Маладзечна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013;

e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Сядзі і глядзі

Сустрэча з любімымі майстрамі

Па-сапраўднаму таленавітых людзей любяць і памятаюць заўсёды. А ўсё таму, што іх светлы след ад створанага ў культуры застаецца і заўважны — як пры жыцці, так і пасля яго. Фільмы любімых акцёраў і рэжысёраў мы пераглядаем, кнігі любімых аўтараў перачытваем і ходзім на спектаклі, пастаўленыя па гэтых творах. Калі ж не атрымліваецца трапіць на «спатканне» з любімымі творцамі, то зрабіць гэта можна і ў тэлеэфіры. Так, у найбліжэйшыя дні на тэлеканале «Беларусь 3» нас чакае шэраг праграм, прэм'ер і мастацкіх кінастужак з нагоды юбілейных дат класікаў кіно, тэатра і літаратуры.

Напрыклад, 31 кастрычніка спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння савецкага акцёра тэатра і кіно, народнага артыста СССР Анатоля Папанава.

З нагоды святочнай даты ў эфіры тэлеканала «Беларусь 3» пакажуць мастацкі фільм «Бацькі і дзяды» (1982 г.) рэжысёра Юрыя Ягорава.

